IK2a
1927


# СТАТУТ

## Беларускага Таварыства „ПРАСЬВЕТА"

Rada Okręgowa na Wojew. Wileńskie
Wydział
Tw-a „Praświety"
Аддзел
Т-ВА „ПРАСЬВЕТЫ"
Акружная Рада па Віленскім Ваяводзтве

ВІЛЬНЯ — 1927.

6 237 86826

BIBLIOTEKA NARODOWA BN

1927. E.O. 674

# СТАТУТ

## Беларускага Таварыства „Прасьвета“.

### 1. Назоў, мэта, месца быцьця і абшар дзеяльнасьці Таварыства.

§ 1.

Таварыства завецца Беларускае Таварыства „Прасьвета“ і мае мэту пашыраць і памагаць прасьвеце.

§ 2.

Таварыства стаіць вонках усіх палітычных партыяў і кірункаў; адзінай яго задачаю ёсьць разьвіцьцё беларускіх школ і беларускае прасьветы наагул.

§ 3.

Дзеля правядзеньня ў жыцьцё мэты, азначанае ў § 1, Таварыства, паміж іншым, мае права, згодна з абавязальнымі юрыдычнымі правіламі:

1) закладаць, удзержываць і паддзержываць: а) народныя школы, б) курсы для дарослых няпісьменных, в) прытулкі, г) школы ўзгадавацелек і настаўніцкія сэмінарыі, народныя чытальні і кніжні (бібліотэкі), д) школы вышэйшыя і сярэднія ўсялякіх тыпаў.

2) закладаць народныя дамы дзеля прасьветы і таварыскае гульні;

3) арганізаваць лекцыі і выклады;

4) выдаваць і пашыраць беларускія школьныя кнігі (падручнікі) і навуковыя часопісі, пэдагогічныя і народныя;

5) даваць вучням і вучаніцам стыпэндыі, падамогі і розную навуковую помач;

6) рабіць проекты будоўлі школ і школьных упарадкаваньняў і мець нагляд над іх выпаўненьнем;

7) абвяшчаць конкурсы, патрэбныя дзеля дапяцьця мэтаў „Беларускага Таварыства „Прасьвета“.

§ 4.

Месца быцьця Цэнтральнае Рады Таварыства ёсьць места Вільня, абшарам дзеяльнасьці — Польская Рэспубліка.

§ 5.

Таварыства ёсьць юрыдычнаю асобаю, можа мець розную рухомую і ляжачую маемасьць, а гэтым самым купляць і прадаваць ляжачую маемасьць.

## II. МАЕМАСЬЦЬ ТАВАРЫСТВА.

§ 6.

Маемасьць Таварыства складаецца:

1) з складчын сяброў (сябровак);

2) з самахвотных ахвяр;

3) з дараў і запісаў;

4) з даходаў з выкладаў, лекцыяў і навуковых гутарак;

5) з процантаў ад жалезнага капіталу;

6) з іншых непарадбачаных прыходаў.

Жалезны капітал складаецца:

1) з скарбаў адумысьля на гэта ахвярованых;

2) з скарбаў, што асыгновуе на гэта Агульная Вялікая Зборка.

§ 8.

Рада Таварыства вядзе рахунковасьць, па водлуг правіл права і звычаяў.

## III. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СЯБРОЎ·

§ 9.

Сябрамі Таварыства могуць быць як фізычныя асобы бяз розьніцы полу, так і асобы юрыдычныя і ўстановы.

УВАГА: Сяброў прыймае Цэнтральная Рада Т-ва звычайнай большасьцю галасоў. Паступаючы кандыдат павінен зложыць дэклярацыю, ссылаючыся на двух запраўдных сяброў Т ва.

§ 10.

Сябры Таварыства дзеляцца на памагаючых, запраўдных і пачэсных.

Сябрам памагаючым можа быць кожная фізычная і юрыдычная асоба, або таксама група людзей, што выплачвае на мэты Таварыства прынамсі 2 зл. п. у год.

Сябрам запраўдным м жа быць кожная фізычная і юрыдычнаыя асоба, або таксама група людзей, плацячая на мэты Таварыства 1,5% свайго месячнага заробку, у разе немагчымасьці вызначэньня сталага заробку 50 (пяцьдзесят) грошай у месяц.

Сяброў пачэсных назначае Агульная Вялікая Зборка па прадстаўленьне Цэнтральнай Рады Т-ва, як прызнаньне асаблівых заслуг на ніве беларускае прасьветы.

Дажыцьцёвым сябрам можа застацца асоба, якая заплаціць на мэты Таварыства 500 зл. п. аднаразова.

§ 11.

Запраўдныя сябры Т-ва маюць права: прымаць учасьце ў дзейнасьцях Гуртка, да якога належаць і галасаваць на зборках гэтага Гуртка, прадстаўляць і паддзержываць на зборках гэтага Гуртка ўсе прапававаньні, што скіраваны да праводзеньня ў жыцьцё мэтаў Таварыства ў межах дазволеных законам, выбіраць і быць выбранымі.

Пачэсныя Сябры маюць права прымаць учасьце ў Агульнай Вялікай Зборцы, калі залічаны да якога Гуртка.—карыстаюць з правоў запраўдных Сяброў, без абавязку ўплаты складчыны.

§ 12.

Сябра можа заўсёды выступіць з Таварыства, аднак-жа абавязаны паведаміць аб гэтым пісьменна Раду свайго Гуртка. Сябра, што ня выплаціў месячнае сяброўскае складчыны, або месячнае % адлічкі, а можа быць выкасаваны з ліку Сяброў Т-ва па пастанове Рады Гуртка, калі, ня гледзячы на пісьменны спамінак, належных грошай не аддае, або калі яго местабыцьцё няведама. Выступленьне, або выкасаваньне з ліку Сяброў не аслабаняе выступаючага або выкасаванага ад павіннасьці заплаціць складчыны за той месяц, у якім захацеў выступіць, або быў выкасаваны. Таксама ён павінен аддаць усе ранейшыя даўгі.

§ 13.

На прапанаваньне Рады Гуртка можа Цэнтральная Рада пастанавіць выключыць Сябра, калі ён шкодзіць Таварыству, або зробіць пастулак проці грамадзянскага гонару.

## IV. ГУРТКІ і АКРУЖНЫЯ РАДЫ Т-ВА „ПРАСЬВЕТА“.

§ 14.

Гурток арганізуецца дзеля правядзеньня ў жыцьцё аднаго або болей заданьняў, нацемленых у статуце Таварыства. Гурток мажа арганізавацца на аснове гэтага статуту ў кожнай мясцовасьці, у якой захоча арганізавацць Гурток прынамсі 10 чалавек, як Сяброў запраўдных, калі Акружная Рада Т-ва прызнае патрэбным арганізавацць Гурток. На чале кожнага Гуртка стаіць Рада, якую выбірае агульная Зборка Сяброў Гуртка.

§ 15.

Гурткі злучаны ў Вакругі, якіх лічба і прастор дзейнасьці па прадстаўленьню Гуркоў азначае Цэнтральная Рада Т-ва.

На чале кожнага Вокругу стаіць Акружная Рада, якую выбірае Акружная Зборка, што складаецца з дэлегатаў усіх Гуркоў данага Вокругу.

§ 16.

Агульныя Вялікія Зборкі ўсіх Гуркоў і Вакругоў склікаюць Управы тых жа Гуркоў і Вакругоў—звычайныя раз у год, над'звычайныя—ў меру патрэбы. Арганізацыю Гуркоў і Вакругоў, межы іх компэтэнцыі ды спосаб зносін з Цэнтральнаю

Радаю Таварыства азначыць інструкцыя, зацьверджаная Агульнаю Вялікаю Зборкаю Таварыства, або з паўнамочча Агульнае Вялікае Зборкі Цэнтральнай Радай Т-ва разам з Нагляднаю Радай. Успамянутая інструкцыя павінна быць прадстаўлена да апрабаты адпаведнай уладзе.

## V. ЦЭНТРАЛЬНАЯ РАДА Т-ВА „ПРАСЬВЕТА".

§ 17.

Цэнтральная Рада складаецца з 12 Сяброў, якіх выбірае Агульная Вялікая Зборка на адзін год. Апрача гэтагага Агульная Вялікая Зборка выбірае на адзін год 4-х заступнікау, якія пераймаюць абавязкі Сяброў Управы, калі Сябры выступяць да году, або ня могуць церав даўжэйшы час спаўняць сваіх абавязкаў.

§ 18.

Сябры Цэнтральнае Рады выбіраюць спаміж сябе на год аднаго Старшыню, двух яго заступнікаў, двух сэкрэтароў, скарбніка і яго заступніка.

§ 19.

Да компэтэнцыі Цэнтральнае Рады належыць:

а) загадаваньне маемасьцяю Таварыства;

б) купляньне і прадаваньне ляжачае маемасьці, процэнтных папераў і розных рухомых маемасьцяў;

в) прыймо дараў і запісаў умоўных і бязумоўных.

г) рабіць розныя ўмовы і даваць усялякага роду паўнамоччы, а паміж іншым і вясьці судовыя справы;

д) рабіць гадавыя справаздачы і бюд'жэты;

е) кіраваць усялякімі справамі Таварыства на аснове гэтага статуту ў межах компэтэнцыі, дадзенае Агульнаю Вялікаю Зборкаю;

ж) прыгатаўляньне інструкцыяў і рэгулямінаў для Цэнтральнае Рады Т-ва.

§ 20.

Рада можа тварыць асобныя аддзелы для паасобных справаў паводле інструкцыі, зацьверджанае Наглядкаю Радаю.

§ 21.

Паседжаньні Цэнтральнае Рады бываюць у меру патрэбы, прынамсі два разы ў месяц. Дзеля важнасьці пастановаў патрэбна прысутнасьць Старшыні або яго Заступніка і прынамсі 6 Сяброў Рады. Пастановы прымаюцца простай большасьцяй галасоў, пры роўнасьці галасоў пераважае голас Старшыні,

§ 22.

Старшыня або яго Заступнік прадстаўляе Таварыства на-вонкі і разам з адным Сэкрэтаром падпісвае ад імя Таварыства ўсе паперы і дакумэнты. Чэкі, загады выплатаў падпісвае Старшыня і Скарбнік Цэнтральнае Рады.

## VII. НАГЛЯДНАЯ РАДА.

§ 23.

Наглядная Рада складаецца з пяцёх Сяброў, якіх выбірае Агульная Вялікая Зборка на адзін год.

Выступаючыя Сябры Нагляднае Рады могуць быць ізноў выбраны

§ 24.

**Наглядная Рада:**

а) рупіцца аб правядзеньні ў жыцьцё заданьняў Беларускага Т-ва „Прасьвета“, згодна з § 1 і 2 гэтага статуту і кантралюе згоднасьць дзеяльнасьці Цэнтральнае Рады ды ўсіх іншых органаў Таварыства з правіламі статуту, рэгулямінаў і інструкцыяў;

б) правярае касу Цэнтральнае Рады, прынамсі раз у год;

в) мае права пераглядаць кнігі і пратаколы паседжаньняў Цэнтральнае Рады і іншых органаў Таварыства;

г) мае права дамагацца, каб Цэнтральная Рада склікала Агульную Вялікую Зборку і паставіла на дзенным парадку справы і праекты, пададзеныя Радаю;

д) мае права задзяржаць кожную пастанову ўладаў Таварыства, супярэчную з прынцыповымі правіламі гэтага статуту, або заданьнямі Таварыства, дамагаючыся адначасна скліканьня Агульнае Вялікае Зборкі дзеля аканчальнай пастановы ў спорнай справе;

е) зацьвярджае рэгуляміны і інструкцыі, аб якіх гутарка ў § 16 і 20 гэтага статуту;

ж) прадстаўляе Агульнай Вялікай Зборцы гадавую справаздачу з свае дзейнасьці і свае проекты;

з) апрача гэтага Сябры Нагляднае Рады могуць з дарадчым голасам прымаць учасьце ў зборках Цэнтральнае Рады і ўсіх органаў Таварыства.

§ 25.

Наглядная Рада можа назначыць спаміж сябе дэлегатаў для рэвізіяў, аб якіх гутарка ў § 24.

§ 26.

Наглядная Рада выбірае спаміж сваіх Сяброў на адзін год Старшыню, 2-х Віцэ-Старшыняў і 2-х Сэкрэтароў.

§ 27.

Паседжаньні Наглядпае Рады бываюць у меру патрэбы, а прынамсі 4 разы ў год. Дзеля важнасьці пастановаў Наглядпае Рады патрэбна быцьцё прынамсі 3-х Сяброў Рады, ў тым ліку Старшыні або аднаго з Віцэ-Старшыняў. Пастановы прымаюцца простай большасьцяй галасоў. Пры роўнасьці ліку галасоў пераважае голас Старшыні.

## VII. АГУЛЬНАЯ ВЯЛІКАЯ ЗБОРКА.

§ 28.

Агульныя Вялікія Зборкі бываюць звычайныя і надзвычайныя. Звычайныя Зборкі склікае Цэнтральная Рада ў Вільні ў першай чэцьверці кожнага году.

§ 29.

Надзвычайныя Зборкі склікае Цэнтральная Рада па сваёй ініцыятыве, або па дамаганьню Наглядпае Рады, або, нарэшце, на дамаганьне прынамсі $^1/_4$ агульнага ліку Акружных Радаў. Цэнтральная Рада мае абавязак склікаць Агульную Вялікую Зборку не пазьней як праз тры тыдні, дастаўшы пісьменнае дамаганьне.

§ 30.

Аб дні і месцы Агульнае Вялікае Зборкі Цэнтральная Рада апавяшчае ў беларускіх газэтах прынамсі, за два тыдні перад днём Зборкі.

§ 31.

Агульная Вялікая Зборка складаецца:
а) з Сяброў Наглядчае Рады,
б) з Сяброў Цэнтральнае Рады і іх заступнікаў,
в) з прэзыдыумаў заўсёдных аддзелаў Цэнтральнае Рады, ня болей як па тры чалавекі з кожнага аддзелу,
г) з дэлегатаў Акружных Рад, па 2 ад кожнае Рады,
д) з дэлегатаў Гурткоў, па 2 ад кожнага Вокругу,
е) з пачэсных Сяброў.

Асобы, што маюць права прымаць учасьце ў Агульных Вялікіх Зборках, ня могуць перадаваць гэтага права іншым.

§ 32.

Агульная Вялікая Зборка ёсьць найвышэйшаю установаю Таварыства, якая выбірае Сяброў Наглядчае Рады, Цэнтральнае Рады і разьвязуе аканчальна ўсялякія справы Таварыства.

§ 33.

Агульная Вялікая Зборка мае права пастанаўляць, калі зьбярэцца, прынамсі, $^{1}/_{4}$ людзей, маючых права прымаць учасьце ў гэтай Зборцы.

Аднак, для пастановаў аб зьмене статуту, ліквідацыі Тававарыства і для пастановаў аб маемасьці

Таварыства пры яго ліквідацыі, вымагаеца быцьцё палавіны Сяброў, якія маюць права ўчасьця ў Агульнай Вялікай Зборцы. У абвешчаньні аб гэткай Зборцы гэта павінна быць выразна сказана. Пры няпрыбыцьці на Агульную Вялікую Зборку, вымаганае дзеля яго правамочнасьці колькасьці Сяброў — будзе Зборка паўторная на два тыдні пазьней і пастановы гэнае Зборкі будуць абавязаць бяз увагі на лік быўшых на Зборцы. У абвестках аб такой зборцы гэта павінна быць выразна адцемлена. На паўторнай Зборцы можна разглядаць толькі справы, што былі на парадку дня першае Зборкі, якая не адбылася.

§ 34.

Пастановы Агульнае Вялікае Зборкі прымаюцца простай большасьцяй паданых галасоў. У справах-жа аб зьмене статуту, ліквідацыі Таварыства і пастановаў аб маемасьці Таварыства пры яго ліквідацыі—большасьцяй $^2/_3$ паданых галасоў.

## VIII. ЛІКВІДАЦЫЯ ТАВАРЫСТВА.

§ 35.

Калі-б Таварыства дзеля якіх-небудзь прычын было зьліквідована або само зьліквідавалася, уся яго рухомая і ляжачая маемасьць пераходзіць на пашырэньне і паддзержку прасьветы ў беларускім нацыянальным духу, згодна з пастановай Агульнае Вялікае Зборкі, або выбранае гэтаю Зборкаю Ліквідацыйнае Камісіі, — аднак, захоўваючы паасобныя ўмовы дараў і запісаў.

(Подпісы) **Ус. Більдзюкевіч.**
**В. Шышкоў.**
**М. К сьцевіч**

Статут залегалізованы на аснове арт. 12 Распараджэньня Гэнэральнага Камісара Усходвіх Земляў аб таварыствах і саюзах з дня 25. IX. 1919 г. рэзалюцыяй Міністра Унутраных Справаў з дня 10 лістапада 1924 г. № ВВ 4937|24.

м. п.

*За Міністра*
(подпіс нячытальны)

*Начальнік Аддзелу*

На падставе рэскрыпту Міністра Унутраных Справаў з дня 10. XI. 1924 году № В. В. 4937|24 ўцягнута ў рэестар таварыстваў і саюзаў у Урадзе Дэлегата Ураду ў Вільні пад № 185 статут таварыства пад назовам „Беларускае Таварыства „Прасьвета" ў Вільні, заключаючы 35 параграфаў, а зацьверджаны рэзалюцыяй Пана Міністра Унутраных Справаў з дня 10. XI. 1924 г.

BIBLIOTEKA NARODOWA BN

Вільня, дня 12-га лістапада 1924 г.

м. п.

(—) Двораноўскі
За Дэлегата Ўраду.

6. IV. 29

Własność

Teodor Wiernikowski